Например: *wer zuletzt lacht …* [4, с. 40]. Автор преднамеренно опускает вторую часть фразеологизма *… lacht am besten*, преследуя определенные цели. Этот прием может выступать как средство привлечения внимания потребителя информации. Читатель непременно заметит такую необычную подачу фразеологизма и сможет лучше уяснить смысл следующего далее материала, где анализируется судьба политика, желающего воспользоваться вторым шансом и вернуться после неудачи на политическую сцену. Вызвав нужные ассоциации у читателя, такой заголовок добавляет в информацию «живой элемент», переключает его на более простые и близкие ему понятия, вызывает к теме интерес.

Удачно трансформированные в заголовках фразеологизмы способны создавать определенную языковую игру, порождать новые ассоциации при сохранении изначального смыслового каркаса фразеологизма. Например: *wenn Liebe blind macht* [5, с. 38]. Изменение структуры фразеологизма позволяет здесь автору избежать штампов при описании отношений между принцем Вильямом и принцессой Кейт, концентрируя внимание читателя на том аспекте, что принцу все нипочем, когда его возлюбленную изображают в неприглядном свете.

Вышесказанное позволяет сделать вывод о том, что устойчивые выражения в большой степени отражают жизнь общества, его культуру и ценности и все активнее видоизменяются, находясь в поисках звучания, отвечающего духу времени. Вполне возможно, что фразеологизмы, квалифицируемые сегодня как трансформированные, предстанут перед читателем через некоторое время как стандартные.

**Литература**


1 Молотков, А. И. Основы фразеологии русского языка / А. И. Молотков. – Л.: Наука, 1977. – 282 с.

2 Брандес, М. П. Стилистика немецкого языка / М. П. Брандес. – М.: Высшая школа, 1990. – 320 с.

3 Clinton liest Republikanern die Leviten [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.sueddeutsche.de/politik/reaktion-auf-anschlaege-von-bruessel-clinton-liest-republikanern-die-leviten-1.2921647. – Дата доступа: 24.03.2016.

4 Da lachen ja die Hühner! / Focus. – 2013. – 18. Februar (Nr. 08). – S. 63.

5 Wenn Liebe blind macht / Stern. – 2014. – 12.6.2014 (Nr. 25). – S. 38.


РЕПОЗИТОРИЙ

**УДК 821.161.3'06-1:141.32**

***А. В. Анцімонік***

## МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ ЎНУТРАНАЙ СВАБОДЫ ЯК ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАЙ ПРАБЛЕМЫ Ў СУЧАСНАЙ ПАЭЗІІ

*У артыкуле на прыкладзе лірыкі сучасных беларускіх паэтаў сярэдняга пакалення А. Сыса, Л. Сом, В. Шніпа, Л. Рублеўскай, Г. Дубянецкай разглядаюцца мастацка-філасофскія падыходы творцаў да асэнсавання ўнутранай свабоды як экзістэнцыйнай катэгорыі. Робяцца высновы аб аксіялагічнай вартасці волі і яе знітаванасці з феноменам смерці, а таксама аб адсутнасці глыбокай і завершанай дэфініцыі свабоды ў тэкстах аўтараў.*

Праблема свабоды з'яўляецца адной з асноўных у філасофіі. У XX стагоддзі гэтае пытанне плённа распрацоўвалася ў працах экзістэнцыялістаў (М. Хайдэгера, Ж.-П. Сартра, А. Шастова, К. Ясперса, М. Бубера і інш.), погляд якіх цікавіць нас найперш у сувязі

з прадметам даследавання – воляй як экзістэнцыйнай праблемай. У разуменні прадстаўнікоў згаданага філасофскага накірунку феномен свабоды разглядаецца зыходзячы з разумення экзістэнцыі (лац. “існаванне”): асэнсоўваючы сябе як экзістэнцыю, чалавек упершыню набывае свабоду і бярэ на сябе адказнасць за тое, як ён яе выкарыстоўвае. Свабода заключаецца ў тым, каб “выбраць” сябе, сфарміраваць сваю асобу на падставе ўласных дзеянняў і ўчынкаў.

Прадстаўнікі рэлігійнага экзістэнцыялізму (К. Ясперс, Г. Марсель, М. Хайдэгер) меркавалі, што свабоду можна спасцігнуць толькі ў існасці Бога. Атэістычныя экзістэнцыялісты (А. Камю, Ж.-П. Сартр, С. дэ Бавуар) лічылі, што чалавек свабодны ў тым сэнсе, які ён сам стварае, калі здзяйсняе выбар і тым самым фарміруе сябе. Нельга пакінуць без увагі і знакамітую выснову Ж.-П. Сартра пра тое, што “<…> чалавек асуджаны быць свабодным” [1], якую ён тлумачыць наступным чынам: “Асуджаны, таму што не сам сябе стварыў, і ўсё-такі свабодны, таму што, аднойчы закінуты ў свет, адказвае за ўсё, што робіць” [1].

У сваю чаргу, мастакі слова, вырашаючы ў сваіх тэкстах праблему свабоды, часцей разглядаюць яе ў якасці прыватнай, індывідуальнай катэгорыі. Па словах В. Заманскай, “<…> генезіс экзістэнцыйнай свядомасці ўдакладняе: праблема свабоды менш за ўсё цікавіць літаратуру ў плане сацыяльным. Катэгорыя свабоды была ўключана ў комплекс праблем жыцця і смерці” [2, с. 34], а таму феномен волі раскрываецца ў мастацкім тэксце звычайна на прыкладзе асобнай унікальнай экзістэнцыі. Мы паспрабуем прааналізаваць мастацкія падыходы да ўвасаблення і асэнсавання свабоды як з’явы ў прадстаўнікоў так званага сярэдняга пакалення беларускай лірыкі (А. Сыса, Л. Рублеўскай, В. Шніпа, Г. Дубянецкай, Л. Сом і інш.) менавіта ў такім кантэксце.

Цікава, што ў філасофска-эстэтычнай сістэме лірычнай творчасці згаданых аўтараў наяўнасць унутранай волі часта выступае неабходнай умовай існавання. Так, ролевы герой Л. Сом падкрэслівае месца свабоды ў сваёй аксіялагічнай сістэме пры дапамозе “адычнага” апявання (верш “Ах не, жанчына гэтая не з лёду…”): “І хай не прывязаць яе [свабоду – А. А.] трывала – / Мне проста немагчыма без яе” [3, с. 61]. Лірычная гераіня Л. Рублеўскай звязвае волю выбару з рэалізацыяй магчымасці застацца ў раі і, адпаведна, не зведаць граху (верш “воля выбару…”) [4, с. 10]. Дарэчы, асэнсоўваючы кошт знешняй свабоды ў вершы “Падземная варта”, паэтка таксама падкрэслівае яе выключную значнасць:

На пальцах – кроў, у вочы – пот, –
Мы выбіраліся на волю,
Капаючы падземны ход
Са спратаў, чорных, як нядоля [5, с. 60].

Яшчэ адзін важны матыў у асэнсаванні паняцця свабоды сучаснымі беларускімі паэтамі – яе цесная знітаванасць з феноменам смерці. Лірычная гераіня верша “Забойства каханых – заўсёдная справа…” Л. Сом атаясамлівае скон з хвілінай “прарыву на волю” [6, с. 26]. Падобная думка гучыць у вершы “Здрада” В. Шніпа, лірычны суб’ект якога ўпэўнены: “<…> ратуюцца смерцю вольныя” [7, с. 26]. Больш за тое, сама цяга, імкненне да смерці (Танатас) у Л. Рублеўскай прыраўніваецца да спосабу дасягнення свабоды (верш “Дзень нараджэння дарогі”). Магчыма, такую ўвагу да сувязі катэгорый волі і скону можна патлумачыць словамі А. Шапэнгаўэра. Паводле філосафа, у момант памірання чалавек набывае поўную незалежнасць: “<…> сапраўдная, першапачатковая свабода зноў наступае ў гэтае імгненне” [8, с. 93]. Таму не дзіўна, што лірычны герой верша “Злодзей” Л. Рублеўскай успрымае магчымасць выбіраць жыццё ці  смерць па ўласным жаданні як вялікі дар: “Я вольны і ў самай смерці – / і гэта мне ўзнагарода” [9, с. 12].

Немалаважным з’яўляецца і тое, што свабода часам уступае ў антанімічныя адносіны з феноменам кахання (прычым такая сувязь, як правіла, асэнсоўваецца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паэткамі-жанчынамі). І ў выніку пакутлівага выбару прага адчуваць сябе вольнай становіцца слабейшай за прагу любіць. У сувязі з гэтым падаецца дарэчнай думка Ж.-П. Сартра, што “<…> адчужае сваю свабоду зусім не каханы, а той, хто хоча быць каханым, і роўна ў той меры, у якой хоча быць каханым” [10, с. 223]. Яркай ілюстрацыяй працытаванага тэзіса можа стаць верш “Сцякалі ў сон” Г. Дубянецкай, у якім лірычная гераіня спалучае неспалучальнае: “вязніцу вольнасці яшчэ яшчэ хісні / як лёгка дыхаць у тваім палоне” [11, с. 36]. Супрацьстаянне кахання і свабоды ў вершах “О, як нясцерпна і прагна..”, “Шыбуеш пешшу…”, “Навыдумлялася кахання…” Л. Сом стварае глебу для пакутлівых роздумаў лірычнай гераіні, якой неабходна выбраць толькі адну з палярных пазіцый. Ролевы герой верша “Балада пра недаступную прыгажосць” Л. Рублеўскай такі выбар ужо здзейсніў на карысць кахання: “Ён адверг сваю волю, бо свет без кахання – пусты” [9, с. 23].

Традыцыйны матыў супрацьпастаўлення свабоды і залежнасці таксама займае даволі важнае месца ў лірыцы паэтаў сярэдняга пакалення. Па-першае, лірычныя героі разумеюць немагчымасць абсалютнай свабоды, якая вырастае з самой людской прыроды, бо, па словах Э. Фрома, “<…> Чалавек ніколі не свабодны ад дыхатаміі свайго існавання: ён ужо не можа вызваліцца ад свайго духу, нават калі б ён гэтага хацеў, і не можа вызваліцца ад свайго цела, пакуль ён жыве…” [12, с. 444–445]. Так, у А. Сыса чытаем:

Чыя нада мной воля? –
гэта іншае пытанне.
І ўсё ж мне падабаецца жыць
у шкляным саркафазе [13, с. 109].
(верш “У шкляным саркафазе”)

Антыномія свабода–залежнасць сустракаецца ў вершах “2. Сцены”, “Балада пра царкву і ваўка”, “Воля на чужыне…” В. Шніпа, “Маналог Апанаса Філіповіча” А. Сыса, “Забойства каханых – заўсёдная справа…”, “Ты выключаеш святло…”, “Зноў прыйшла туга – тугі адбітак болю…” Л. Сом, “Птушкі любяць волю. Ды бывае зрэдку…”, “Балада пра Якуба Венжыка” Л. Рублеўскай і інш. Лірычныя героі згаданых твораў, абвострана-балюча ўспрымаючы сваё залежнае становішча, не бачаць, тым не менш, выйсця з такой сітуацыі альбо па прычыне ўсведамлення сваёй слабасці і немагчымасці змяніць звыклы парадак рэчаў, альбо з-за перакананасці ў непатрэбнасці абсалютнай свабоды ў звычайным, будзённым існаванні: “сцены забіраюць у нас волю / але забіраючы волю / сцены бароняць нас” [9, с. 71] (верш “2. Сцены” В. Шніпа).

Па-другое, паэты акцэнтуюць сваю ўвагу на тым, што нярэдка воля губляе сваю прыцягальнасць і каштоўнасць, абменьваецца чалавекам на больш зручныя матэрыяльныя ўмовы, грошы, добраахвотную залежнасць, палон (вершы “Балада пра Якуба Венжыка”, “1864”, “Грукоча глуха прэс друкарскі…” Л. Рублеўскай, “Рабам так страшна волю мець…” В. Шніпа і інш.). Несвабода, такім чынам, знаходзіць сваё метафарычнае азначэнне ў паэтычных тэкстах праз сімвалічныя вобразы “шклянога саркафага” (А. Сыс), “ланцугоў” (Г. Дубянецкая, В. Шніп), “няволі” (Л. Рублеўская), “залатой клеткі” (Л. Рублеўская), “кратаў” (В. Шніп, Л. Сом), “палону” (Л. Рублеўская, Г. Дубянецкая, В. Шніп) і інш.

Паказальна, што паняцце волі зрэдку ўспрымаецца лірычнымі героямі ў асэнсаванні яго побач з катэгорыяй страху. Прычым суадносіны гэтых дзвюх экзістэнцыйных катэгорый маюць амбівалентную прыроду. У некаторых выпадках лірычны герой асцерагаецца свабоды, баіцца яе па прычыне неспасціжнасці дадзенага феномена (як, напрыклад, у вершы “Балада волі” В. Шніпа). З аднаго боку, ён успрымае волю як з’яву, што малаверагодна спазнаць, як адказны крок за межы сваёй “сумнай долі” [14, с. 34]. З другога – папракае людзей за бяздзейснасць, за няздольнасць дасягнуць свабоды. Але страх аказваецца больш магутнай стыхіяй: “Не пускайце мяне вы на

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

волю, / Бо я волі баюся, як вы” [14, с. 34]. У іншых выпадках пры дапамозе катэгорыі страху перадаецца занепакоенасць ролевага героя адносна магчымасці страты свабоды ў выпадку выбару ім кахання (верш “Я баяўся страціць волю…” Л. Сом). З яго вуснаў гучыць даволі банальнае апраўданне свайго сыходу ад дзяўчыны: “Я баяўся страціць волю” [3, с. 64].

Нягледзячы на тое, што прадстаўнікі сярэдняга пакалення нярэдка звяртаюцца да катэгорыі свабоды, цэласнага філасофскага асэнсавання ці хаця б яе паэтычнай дэфініцыі ў сучаснай лірыцы дадзены феномен не знаходзіць. Адзінкавыя рытарычныя пытанні кшталту: “Што воля? Хто яе спазнаў?” [15, с. 107] (як, да прыкладу, у вершы Л. Рублеўскай “Рабам так страшна волю мець…”) – так і застаюцца без адказу. Аднак гэта не азначае, што катэгорыя волі пазбаўлена метафарычнага асэнсавання ў тэкстах. Яе ўвасабленнем найчасцей становіцца вецер (вершы “І мяне натхняе воля…” А. Сыса, “Ефрасіння” Л. Рублеўскай, “Балада волі” В. Шніпа і інш.). Згодна з сімвалічным дэкадзіраваннем, “<…> З аднаго боку, прымаецца да ўвагі ненадзейнасць ветру, яго няўстойлівасць, а з другога – яго даволі адчувальнае дзеянне” [16, с. 40]. Акрамя таго, воля нярэдка падаецца праз метафарычныя азначэнні (вершы “Пакіньце багоў у спакоі…”, “Калі мне стане ўсё адзіна..”, “Ах не, жанчына гэтая не з лёду…”, “Забойства каханых – заўсёдная справа…”, “О, як нясцерпна і прагна…” Л. Сом, “І мяне натхняе воля…” А. Сыса і інш.), найбольш арыгінальным сярод якіх падаецца наступны вобраз: “Воля – лепшая з каляжанак” [3, с. 93] (верш “Я нікому не вінна болей…” Л. Сом).

Такім чынам, праблема свабоды знаходзіць сваё адлюстраванне ў лірыцы беларускіх паэтаў сярэдняга пакалення праз сцвярджэнне яе каштоўнасці для паўнавартаснага быцця і знітаванасць з феноменам смерці, што ў многім сугучна з разуменнем катэгорыі волі экзістэнцыялістамі. Нярэдка паняцце свабоды асэнсоўваецца ў вершах А. Сыса, Л. Рублеўскай, В. Шніпа, Г. Дубянецкай, Л. Сом праз яе традыцыйнае супрацьпастаўленне залежнасці. Аднак сама па сабе праблема волі не набывае глыбокафіласофскага і завершанага сэнсавага вызначэння ў тэкстах паэтаў сярэдняга пакалення, застаючыся неспасціжным феноменам і адначасова адным з цэнтральных паняццяў аксіялагічнай сістэмы чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### Літаратура


1 Сартр, Ж.-П. Экзистенциализм – это гуманизм [Электронный ресурс] / Ж.-П. Сартр. – М.: «Полиздат», 1989. – URL: http://www.psylib.org.ua/books/sartr01/index.htm (дата обращения: 10.04.2016).

2 Заманская, В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границе столетий / В. Заманская. – М.: Флинта: Наука, 2002. – 304 с.

3 Сом, Л. Свабода Слова Зіма: вершы / Л. Сом. – Мінск: Логвінаў, 2005. – 130 с.

4 Рублеўская, Л. Балаган / Л. Рублеўская. – Полацк-Мінск: выдавецкая суполка “Полацкае ляда”, 2000. – 56 с.

5 Рублеўская, Л. Замак месячнага сяйва: вершы / Л. Рублеўская. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 126 с.

6 Сом, Л. Каралева прыйдзе ноччу: вершы пра каханне / Л. Сом. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2007. – 88 с.

7 Шніп, В. Балада камянёў: паэзія і проза / В. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 318 с.

8 Шопенгауэр, А. Метафизика половой любви / А. Шопенгауэр. – СПб.: Издательский дом “Азбука-классика”, 2008. – 224 с.

9 Рублеўская, Л. Рыцарскія хронікі. Шніп, В. Воўчы вецер / Л. Рублеўская, В. Шніп. – Маладзечна, 2001. – 82 с.

10 Сартр, Ж.-П. Первичное отношение к другому: любовь, язык, мазохизм / Ж.-П. Сартр // Проблема человека в западной философии: сборник переводов с английского, немецкого, французского / под ред. Ю. Н. Попова. – М.: Прогресс, 1988. – С. 207–228.

11 Дубянецкая, Г. Анадыямэна: вершы / Г. Дубянецкая. – Мінск: “Медисонт”, 2008. – 92 с.
12 Фромм, Э. Пути из больного общества / Э. Фромм // Проблема человека в западной философии: сборник переводов с английского, немецкого, французского ; под ред. Ю. Н. Попова. – Москва: Прогресс, 1988. – С. 443 – 482.
13 Сыс, А. Лён: выбраныя творы / А. Сыс. – Мінск: Кнігазбор, 2006. – 436 с.
14 Шніп, В. Інквізіцыя / В. Шніп. – Маладзечна: Бібліятэчка часопіса “КУФЭРАК Віленшчыны”, 2002. – 84 с.
15 Шніп, В. Выратаванне атрутай. Рублеўская, Л. Над замкавай вежай / В. Шніп, Л. Рублеўская. – Маладзечна, 2003. – 128 с.
16 Бидерманн, Г. Энциклопедия символов / Г. Бидерманн. – М.: Республика, 1996. – 335 с.

**УДК 613.71:796.853.264**

***В. В. Атаманчук, С. А. Быковский***

## ФИЗИЧЕСКАЯ РЕАБИЛИТАЦИЯ ПРИ ТРАВМАХ У СПОРТСМЕНОВ, ЗАНИМАЮЩИХСЯ КИОКУШИН КАРАТЭ

*Занятия физической культурой и спортом, наряду с развитием физических качеств и повышением уровня здоровья, зачастую изобилует травмами. В данной статье представлены наиболее часто встречающиеся травмы у спортсменов-единоборцев, а также средства и методы физической реабилитации спортсменов в пост иммобилизационный период.*

Каратэ – японское боевое искусство, система защиты и нападения. В отличие от других единоборств Японии, (джиу-джитсу, дзюдо), которые предполагают борьбу, проведение разного рода бросков, удерживающих захватов и удушающих приёмов, в каратэ для сокрушения противника используются точно нацеленные мощные удары руками и ногами, наносимые в жизненно важные точки его тела. Поединки проводятся с полным контактом, без использования защитного снаряжения, что приводит к максимальной вероятности травматизма. Досрочной победой на соревнованиях по каратэ является нокаут или два нокдауна, что приводит к выведению соперника из состояния боевой эффективности что, естественно, сопровождается болью или потерей сознания.

Практика показывает, что контактный вид спорта подразумевает свои специфические травмы. К наиболее типичным травмам при занятиях каратэ Киокушинкай относятся ушибы мягких тканей верхних и нижних конечностей, ушибы головы и лица, травмы сумочно-связочного аппарата. К наиболее тяжелым повреждениям относятся сотрясения и ушибы головного мозга, переломы длинных трубчатых костей верхних и нижних конечностей, переломы ребер, а также повреждения внутренних органов грудной и брюшной полостей.

Основными причинами травматизма в соревновательной деятельности единоборцев являются:

– отсутствие разделения спортсменов на возрастные и весовые категории или слишком большая разница в них;
– недостаточный уровень подготовки спортсмена к данному виду соревнований;
– чрезмерный уровень подготовки спортсмена к данному виду соревнований;
– неумышленное нарушение правил соревнований;
– умышленное нарушение правил соревнований;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ